3. Моргания. Не менее ста раз легко и быстро поморгайте глазами.

4. На вдохе посмотрите в правый верхний угол (приблизительно 45° от вертикали) и, не задерживаясь, верните глаза в исходное положение. На следующем вдохе посмотрите в нижний левый угол и на выходе верните глаза в исходное положение.

5. «Близко-далеко». Подойдите к окну, внимательно посмотрите на близко расположенный предмет, например, на оконную раму, а затем вдаль, например, на дерево.

6. Круговые движения. Сделайте круговые движения открытыми глазами: сначала по часовой стрелке, затем – против.

7. Сильно зажмурить глаза, а затем расслабить мышцы несколько раз.

8. Описываем взглядом плавно фигуры: горизонтальная восьмерка, вертикальная восьмерка, буквы.

9. Необходимо сесть перед столом так, чтобы спина была ровной. Локти положить на стол, ладонями закрыть глаза. Ладони складываются домиком. Длительность от 30 сек. Во время упражнения глаза должны находиться в полной темноте.

Благодаря всем этим упражнениям гаджеты не принесут вреда вашему здоровью, а правильное использование современных технологий, принесет только пользу. Но не забывайте, что общение с друзьями и свежий воздух не заменит ни один гаджет!

УДК 373.1

АРГАНІЗАЦЫЯ ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ АДУКАЦЫЙНАГА ВЭБ-КВЕСТА

І.Р. Казачэнка
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Лельчыцкая раённая гімназія»,
Рэспубліка Беларусь
l23i06g@gmail.com

Анатацыя. У артыкуле прадстаўлены арыгінальныя спосабы выкарыстання Web-сэрвісаў у арганізацыі і правядзенні даследчай дзейнасці навучэнцаў. Прапанаваны варыянт уключэння навучэнцаў у гэты працэс дазваляе ствараць умовы для арганізацыі даследчай дзейнасці школьнікаў дыстанцыйна, развіцця ў вучняў інфармацыйна-камунікацыйнай кампетэнтнасці.

Ключавыя словы: даследчая дзейнасць школьнікаў, Web-сэрвісы, вэб-квэст.

ORGANIZATION OF RESEARCH ACTIVITIES OF SCHOOL CHILDREN BY MEANS OF EDUCATIONAL WEB QUEST

I.G. Kozachenko
State Educational Institution
«Gymnasium of Lelchytsy District «
Republic of Belarus
l23i06g@gmail.com

Abstract. The article presents original ways of using Web-services in organizing and conducting research activities of students. The proposed option of involving students in this process allows to create conditions for the organization of research activities of school children remotely, the development of students' information and communication skills.

Key words: research activities of school children, Web services, web-kvest.

На сучасным этапе развіцця адукацыі адной з прыярытэтных задач з’яўляецца пошук новых форм арганізацыі вучэбна-даследчай дзейнасці школьнікаў. У гэтым плане шырокія магчымасці для фарміравання даследчай кампетэнтнасці навучэнцаў прадстаўляюць вэб-тэхналогіі.

Фарміраванне даследчай кампетэнцыі школьнікаў мэтазгодна ажыццяўляць, выкарыстоўваючы ў арганізацыі даследавання інтэрнэт-тэхналогіі, у прыватнасці, у ходзе праходжання вэб-квестаў, якія забяспечваюць у працэсе навучання віртуальнае асяроддзе разглядаемых пытанняў, матывуюць школьнікаў да самастойнай даследчай дзейнасці, развіваюць інфармацыйную культуру.

Веб-квест у педагогіцы – гэта сістэма заданнняў з элементамі гульні, для выканання якіх выкарыстоўваюцца розныя інфармацыйныя рэсурсы, у тым ліку і рэсурсы сеткі інтэрнэт. Адукацыйны веб-квест прызначаны для самастойнай работы вучня па засваенні ці замацаванні ведаў. Настаўнікам ствараюцца ўмовы для самастойнай разумовай і творчай дзейнасці навучэнцаў і падтрымліваецца іх ініцыятыва.

Вэб-квест мае на мэце самастойную пошукавую работу вучняў у сетцы інтэрнэт з наступнай апрацоўкай адабранай інфармацыі (крытычны аналіз, адбор, класіфікацыя, сістэматызацыя інфармацыі і інш.) і прадстаўленнем вынікаў у спецыяльна выбранай форме, напрыклад, прэзентацыя, выступленне.

Веб-квест традыцыйна складаецца з наступных раздзелаў: легенда (для вучняў), заданне (фармуліроўка праблемнай задачы і апісанне формы прадстаўлення вынікаў), парадак работы і неабходныя рэсурсы (тэхналогія выканання задання, паслядоўнасць деянняў), крытэрыі ацэнкі (змястоўнасць, лагічнасць прадстаўлення інфармацыі і інш.), заключэнне (сціслае апісанне ведаў, уменняў і навыкаў, якія фарміруюцца ў выніку праходжання вэб-квеста), выкарыстаныя матэрыялы (спасылкі на розныя крыніцы інфармацыі і вэб-рэсурсы).

Прапаную вам пазнаёміцца з вэб-квестам «Разгадка таямніц», вынікам якога стала вучэбна-даследчая работа па аповесцях А. Конан Дойла «Сабака Баскервіляў» і У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха».

Для правядзення вэб-квеста быў падрыхтаваны матэрыял, які даступны па спасылцы https://view.genial.ly/60b120e288ed480dacf9a51c/interactive-image-interactive-image.

Адкрывае вэб-квест ***легенда, інтрыга***: «Пра дэтэктывы многа спрачаюцца. Яшчэ больш іх чытаюць. Ужо назва жанру гаворыць пра многае.

Таямнічае заўсёды абуджала чалавечую цікаўнасць, але прафесійнае расследаванне ў літаратурным творы, пры якім таямніца злачынства так да канца і застаецца неразгаданай, трымае чытача ў напружанні.

Дэтэктыў – гэта жанр для чытачоў з вострым розумам і любоўю да загадак. Ён вучыць думаць, канцэнтраваць увагу на дэталях, лепш разбірацца ў псіхалогіі».

КРОК 1. На першым этапе даследавання прапаную вучням прачытаць аповесці У.Караткевіча і А.Конан Дойла, а таксама пазнаёміцца з экранізацыямі гэтых твораў. Для гэтага размяшчаю на інтэрактыўным плакаце спасылкі на творы і іх экранізацыі.

КРОК 2. Аповесць У.Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха вывучаецца на ўроках беларускай літаратуры ў 9 класе. Гэта стала наступным крокам на шляху вучнёўскага вучэбнага даследавання. На дадзеным этапе змест самастойнай работы вучняў вызначаецца спецыфікай мастацкага тэксту, задачамі яго аналізу, асаблівасцямі ўспрыняцця твора вучнямі. Самастойная работа пры вывучэнні твораў сярэдняй эпічнай формы дзеліцца на шэраг звязаных паміж сабой частак, якія паслядоўна вядуць да вырашэння пастаўленай праблемы: напрыклад, разгадаць таямніцы аповесці як дэтэктыўнага жанру. Ступень самастойнасці пры вырашэнні чарговага пытання можа быць рознай, але нязменным застаецца тое, што неабходнасць пошуку адказу стымулюе пазнавальную дзейнасць вучняў.

Прыёмы, якія можна выкарыстоўваць настаўніку: супастаўленні з кніжнымі ілюстрацыямі, творамі жывапісу і скульптурнымі вобразамі, экранізацыямі мастацкіх фільмаў; з музычнымі творамі, створанымі па матывах праграмных; супастаўленне двух ці некалькіх твораў на падобныя тэмы, заданнні на супастаўленне двух ці трох герояў розных твораў, г.зн. заданні, якія патрабуюць больш шырокага знаёмства з крытычнай літаратурай. Гэтыя заданні звязаны з тэарэтычнай падрыхтоўкай, з чытаннем адпаведнай літаратуры хаця б у невялікіх маштабах. Вучні набываюць навыкі знаходзіць звесткі па даведніках, энцыклапедыях, вучацца цытаваць літаратурныя крыніцы і ўказваць іх.

У гэтым дапамагаюць падабраныя і распрацаваныя мной інтэрактыўныя практыкаванні:

Знайдзі 10 герояў аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», схаваных у гэтай табліцы	https://learningapps.org/display?v=pbs67d41n17
Расстаў па парадку падзеі, апісаныя ў легендзе пра караля Стаха	https://learningapps.org/display?v=ps8dxc59k20
Разгадай таямніцы маёнтка Балотныя Яліны	https://learningapps.org/display?v=pycnkx5ut20
Суаднясі цытату і імя персанажа аповесці	https://learningapps.org/display?v=phjrvm3t520
Суаднясі цытату і эпізод мастацкага фільма па аповесці У. Караткевіча	https://learningapps.org/display?v=p14m55jrn20
Відэаквіз	https://learningapps.org/view20368955

КРОК 3. Наступным этапам пошукавай дзейнасці з’яўляецца сістэматызацыя матэрыялаў даследавання. Прапаную работу зацікаўленаму вучню. Для сістэматызацыі даследаванага матэрыялу ўдзельніку квеста вызначаны наступныя заданні:

1. Знайдзіце ў слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў / Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі / інтэрнэт-крыніцах значэнне тэрміна «дэтэктыў» і занатуйце яго.
2. На аснове слоўнікавага артыкула, інтэрнэт-крыніц, прачытаных вамі твораў вызначце і запішыце 5 прымет дэтэктыва як літаратурнага жанра.
3. Вызнаце тыповых персанажаў дэтэктыўнага твора.
4. Персанаж літаратурнага дэтэктыва, які непасрэдна займаецца расследаваннем, – гэта вышукоўца. Вызначце агульнае і адметнае ў вобразах вышукоўцы аповесцей А. Конан Дойла і У. Караткевіча. Занатуйце вывады ў табліцы.

Персанаж, які непасрэдна займаецца расследаваннем	
Аповесць «Сабака Баскервіляў»	Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»
Шэрлак Холмс	***Андрэй Беларэцкі***
вышукоўца-прафесіянал, валодае выключнымі здольнасцямі, эксперт вельмі высокага ўзроўню, ён не служыць у паліцыі	непрафесіянал, чалавек, які не валодае ніякімі выключнымі здольнасцямі, расследаванне вядзе воляю абставін
Літаратурныя персанажы адметныя	

5. Вызначце, хто з персанажаў кожнай аповесці з’яўляецца злачынцам, пацярпелым, сведкам, падазраваным, хто выступае ў ролі кампаньёна вышукоўцы ў абодвух творах. Занатуйце вывады ў табліцы.

тыповыя персанажы аповесці «_____»			
злачынца	пацярпелы	сведка	падазраваны
кампаньён дэтэктыва-аматара			

6. З выбранай вамі інфармацыі сістэматызуйце і аб'яднайце ў прапанаваную табліцу літаратурныя аналогіі дэтэктыўных аповесцей.

Крытэрый	Твор	Твор
Вядзе расследаванне		
Род заняткаў / прафесія		
Падзеі адбываюцца		
Пацярпелы		
Прычына злачынства		
У аснову злачынства легла		
Мастацкія дэталі		
Злачынца пакараны		

7. Састаўце план вучэбна-даследчай работы.

КРОК 4. На наступным этапе вучым афармляць вучэбнае даследаванне: тытульны ліст, змест, уводзіны, асноўная частка, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадатак (калі ёсць).

Як бачым, фарміраванне навыкаў даследчай работы, выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, уменне працаваць з інфармацыяй, кіраванне ёю, яе ацэнка і стварэнне выходзяць на першы план. Усё гэта адкрывае новыя магчымасці для атрымання эфектыўнага выніку ў развіцці пошукавай дзейнасці вучняў і разам з тым іх інфармацыйна-камунікацыйнай кампетэнтнасці.

Калі вэб-квест – гэта выкананне вучэбна-даследчай работы, трэба пазнаёміць вучняў з распрацаванымі крытэрыямі.

Такім чынам, вэб-квест падтрымлівае навучанне на ўзроўні мыслення, аналізу, сінтэзу і ацэнкі; удзельнік квеста атрымлівае дадатковую магчымасць экспертызы сваіх творчых здольнасцей і ўменняў; удзельнік квеста вучыцца выкарыстоўваць інфармацыйную інтэрнэт-прастору для пашырэння сферы сваёй даследчай дзейнасці; размяшчэнне вэб-квестаў у сеціве дазваляе значна павысіць матывацыю вучняў для дасягнення найлепшых вынікаў.

ВЫНІКАМ з’явілася прадстаўленне вучэбна-даследчай работы на раённай практычнай канферэнцыі вучняў «Залатыя россыпы», дзе работа была адзначана дыпломам I ступені.

РЭСУРСЫ

Праблема павышэння якасці самастойнай адукацыйнай дзейнасці школьнікаў ва ўмовах інфарматызацыі адукацыі можа быць вырашана за кошт выкарыстання розных інтэрнэт-рэсурсаў.

Вэб-квест створаны і размешчаны у рэсурсе, які называецца Genially.

Спіс літаратуры

1. Интерактивный плакат. – Режим доступа: http://project19887.tilda.ws/visual1. Дата доступа: 23.06.2021
2. Казачэнка, І. Р. Арганізацыя пошукавай дзейнасці школьнікаў: вэб-квест / І. Р. Казачэнка // Роднае слова. - 2018. – №1. – С.57 – 59.
3. Николаева, Н. В. Образовательные квест-проекты как метод и средство развития навыков информационной деятельности учащихся [Электронный ресурс] / Н. В. Николаева. – Режим доступа : http://rcio.pnzgu.ru/vio/07/ cd_site/Articles/art_1_12.htm.

УДК 373.1

УРОК ДЛЯ УЧИТЕЛЕЙ «СЧАСТЛИВЫЙ УЧИТЕЛЬ»

И.В. Каравай, М. Барановская, Д. Рылькова,
А. Пригожая, В. Ткачева
ГУО «Гимназия № 3 г. Минска»
Республика Беларусь
irina_karavai@mail.ru

Аннотация. Представлен сценарий урока для учителей, приуроченного ко Дню учителя, как форма организации педагогических проб для учащихся педагогических классов/групп.

Ключевые слова: урок для учителей, учащиеся педагогической группы, педагогические пробы, счастливый учитель, мастер-класс.

LESSON FOR TEACHERS «HAPPY TEACHER»

I.V. Karavai, M. Baranovskaya, D. Rylkova,
A. Prigozhaya, V. Tkachyova
State Educational Institution
«Gymnasium No. 3 of Minsk»
Republic of Belarus
irina_karavai@mail.ru

Abstract. The script for a lesson for teachers timed to Teacher’s Day is presented as a form of organizing pedagogical tests for students of pedagogy classes and groups.

Key words: lesson for teachers, students of pedagogy group, pedagogical tests, happy teacher, master class.